# РАЗВІЦЦЁ ЛІТАРАТУРНА-ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І Ў ПАЗАКЛАСНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ



**Арлова Ала Генадзьеўна,**
*настаўніца беларускай мовы і літаратуры ДУА "Бачэйкаўская сярэдняя школа Бешанковіцкага раёна"*

Репозиторий ВГУ

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ АСОБЫ ВУЧНЯ – АКТУАЛЬНАЯ ЗАДАЧА СУЧАСНАЙ ШКОЛЫ

*У артыкуле прадстаўлены вопыт работы па развіцці літаратурна-творчых здольнасцей вучняў. Стварэнне вучнямі ўласных адукацыйных "прадуктаў" – аснова для рэалізацыі адной з галоўных задач навучання літаратуры – выхаванне асобы з ярка выяўленымі творчымі схільнасцямі, здольнай эстэтычнае ўспрыняцце пераўтварыць у стымул да маральнага самаўдасканалення, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.*

**Уводзіны.** Праблемай развіцця літаратурных здольнасцей вучняў займаліся многія даследчыкі. Розныя аспекты гэтай праблемы знайшлі адлюстраванне ў навуковых працах І. Аркіна, Г. Кудзінай, В. Левіна, В. Русілкі, А. Руцкай, В. Смыкоўскай. Вопыт далучэння вучняў да літаратурнай творчасці маюць такія вядомыя настаўнікі Беларусі, як А. Белакоз, В. Туркевіч, Т. Трафімчык, Г. Аўласенка, І. Волкаў, Л. Ясевіч. Разам з тым у педагагічнай тэорыі і практыцы не поўнасцю выяўлены асаблівасці развіцця літаратурных здольнасцей і спосабы іх фарміравання. Таму ў 1991 годзе я звярнулася за кансультацыяй па гэтым пытанні да Алеся Белакоза, які адказаў на мой ліст на старонках часопіса "Беларуская мова і літаратура ў школе". Ён адзначыў: "Лічу, што кожны чалавек павінен выпрацаваць сваю методыку, аднак і дапамога часам можа паўплываць на поспех" [1, с. 39]. Я ўзялася за гэту нялёгкую справу з жаданнем выявіць магчымасці развіцця літаратурных здольнасцей вучняў праз выкарыстанне сістэмы творчых заданняў на ўроках і ў пазакласнай дзейнасці, прымяняючы эфектыўныя метады і прыёмы, выкарыстоўваючы элементы французскай майстэрні.

**Асноўная частка.** Адораныя дзеці – галоўнае нацыянальнае багацце, аснова будучых поспехаў дзяржавы ва ўсіх сферах жыцця. Таму не выпадкова Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь у якасці аднаго з важнейшых элементаў уключае ў сябе праблему развіцця і рэлізацыі іх творчага патэнцыялу. Сучаснае грамадства мае патрэбу ў неардынарных асобах, адказных, здольных крэатыўна мысліць, тварыць, прымаць нестандартныя рашэнні ў розных сітуацыях. Другая прычына, якая робіць праблему развіцця літаратурна-творчай дзейнасці актуальнай, – падрыхтоўка вучняў да ўдзелу ў розных творчых конкурсах і алімпіядах ад узроўню раённых да рэспубліканскіх. Я згодна з думкай А.Я. Ленсу, якая адзначала: "Задача разумовага, маральнага і эстэтычнага развіцця школьнікаў заключаецца не ў тым, каб з кожнага вучня «зрабіць» пісьменніка, а ў тым, каб развіць якасці, якія абумоўліваюць літаратурныя здольнасці (назіральнасць, вострую памяць, у тым ліку і зрокавую, творчае ўяўленне), не-

абходныя чалавеку ва ўсякай працоўнай дзейнасці” [3, с. 4]. Выяўленне і развіццё літаратурна-творчых здольнасцей можа быць карысным і для падрыхтоўкі да творчых прафесій. Мэтай майго вопыту з’яўляецца развіццё творчых здольнасцей вучняў праз напісанне вершаў, апавяданняў, замалёвак на тэмы, якія спрыяюць самаўдасканаленню асобы, вучаць назіральнасці і фантазіі, уменню карыстацца мастацкім словам.

У першую чаргу я высветліла ўзровень зацікаўленасці вучняў літаратурнай творчасцю, ступень сфарміраванасці іх эстэтычнай пазіцыі і творчага ўяўлення, стварыла аптымальныя ўмовы для развіцця творчай асобы, якая адчувае задавальненне ад разумовай працы. Усім вядома: настаўнік-славеснік выкладае ў школе мастацкае слова – адметную дысцыпліну, якая ўздзейнічае адначасова і на эмоцыі вучня, і на яго розум. Славеснік павінен мець творчы падыход да прадмета выкладання. Трэба быць асобай цікавай, якая не прыгнятае сваім аўтарытэтам, а вучыць творчаму падыходу да з’яў мастацтва. Я стараюся творча адносіцца да сваёй працы, у арбіту сваёй дзейнасці ўключаю і вучняў. Маё педагагічнае крэда – вучыць і вучыцца ў атмасферы творчасці. Таму я знаёмлю вучняў са сваім партфоліа, расказваю пра перамогі ў конкурсах. Пад уплывам у іх з’яўляецца жаданне не толькі больш чытаць, але і спрабаваць свае творчыя сілы ў паэзіі і прозе. Галоўнае для настаўніка – знайсці эфектыўныя метады і прыёмы ў сваёй працы, каб развіваць літаратурныя здольнасці навучэнцаў. Дзейнасць па развіцці літаратурных здольнасцей складаецца з некалькіх этапаў.

**Алгарытм дзейнасці па развіцці літаратурных здольнасцей**

1. Дыягностыка (анкетаванне, гутарка, назіранне, правядзенне дыягнастычных гульняў).
2. Знаёмства вучняў з асновамі тэорыі літаратуры (вершаскладанне, стылі і тыпы маўлення, мастацкія асаблівасці твора і г.д.).
3. Трэніровачныя практыкаванні.
4. Напісанне літаратурных твораў (вершы, апавяданні, казкі, замалёўкі).
5. Карэкцыя, рэдагаванне напісанага.
6. Падрыхтоўка твораў да друку, выпуск зборніка).

Разгледзець адоранае дзіця складана. На сённяшні дзень не распрацаваны адзіны дыягнастычны інструментарый для выяўлення такіх дзяцей. І тым не менш дыягностыку творчай актыўнасці я праводжу пры дапамозе метадаў назірання, гутаркі, анкетавання. Таксама сюды можна аднесці практычны вопыт, інтуіцыю, памкненні саміх адораных дзяцей.

Выяўленне вучняў, здольных да літаратурна-мастацкай творчасці – станоўчы працэс, звязаны з аналізам канкрэтнага дзіцяці. У гэтай сувязі вырашаюцца наступныя задачы:

- вылучэнне найбольш здольных, зацікаўленых дзяцей;
- складанне перспектыўнага плана работы;
- забеспячэнне вучняў рознымі заданнямі;
- назіранне за творчым ростам дзіцяці;
- знаходжанне магчымасцей праяўлення вучняў у розных відах дзейнасці;
- пастаяннае павышэнне настаўнікам свайго адукацыйнага ўзроўню;
- папаўненне псіхалагічных ведаў па рабоце з таленавітымі дзецьмі.

У аснову гэтай працы пакладзены наступныя прыцыпы развіцця літаратурнай творчасці школьнікаў: прынцып даступнасці, улік узроставых і асобасных асаблівасцей вучняў, свабода выбару жанру літаратурнай творчасці, практычная накіраванасць. Адной з важнейшых умоў у арганізацыі творчых вучэбных заняткаў з’яўляецца стварэнне атмасферы добразычлівасці і даверу, якая абуджае ў вучняў патрэбнасць у творчым самавыражэнні.

Стварэнне ўнутранай матывацыі вучня, карэктная педагагічная дапамога, спалучэнне разнастайных формаў працы, стварэнне сітуацыі поспеху, разнастайнасць творчых заданняў, паслядоўнасць і сістэмнасць у развіцці творчых здольнасцей адыгрываюць вялікую ролю ў працы з адоранымі вучнямі.

Да самых важных літаратурна-творчых здольнасцей мы адносім уменне мысліць мастацкімі вобразамі, здольнасць да вобразных абагульненняў, авалоданне асацыятыўным багаццем слова. Для развіцця здольнасці тварыць часта выкарыстоўваем нестандартны пачатак урока: “Паглядзіце, які сёння незвычайны дзень”, “Уяўляеце, выходжу я ўчора

Рэпазіторый ВДУ

са школы, а мне ў партфель упаў кляновы лісток. Што ён мог мне расказаць?”. Дзеці вучацца назіраць, супастаўляць, шукаць трапнае слова, параўноўваць, урэшце – вучацца думаць, адчуваць. Апора на пачуцці здзіўлення, навізны, гатоўнасці прыняць нестандартную сітуацыю з’яўляецца важнай умовай развіцця крэатыўнасці ў дзяцей. Вучні выконваюць творчыя заданні, якія развіваюць вобразнае ўяўленне праз калектыўную і індывідуальную творчасць пры напісанні вершаў і празаічных твораў, працу па карэкцыі.

Але без ведання тэорыі літаратуры навучыць пісаць вершаваныя і празаічныя творы складана. Таму на другім этапе я знаёмлю вучняў з тэхнікай вершаскладання, паўтараем асаблівасці стыляў і тыпаў маўлення, паглыбляем веды пра план, сюжэт, галоўнага героя, мастацкія прыёмы.

На трэцім этапе адбываецца знаёмства навучэнцаў з рознымі відамі мастацтва, з іх вобразамі на аснове метада ілюстравання. Напрыклад, пры вывучэнні твораў пра поры года дэманструю вучням рэпрадукцыі карцін дадзенай тэматыкі, даю паслухаць класічную музыку, разам чытаем творы іншых беларускіх аўтараў. Выражэнне перажывання праз мастацкі вобраз, асацыятыўнасць мыслення спрыяюць пачатку творчай дзейнасці.

На ўроках літаратуры прымяняю рознабаковыя метады і прыёмы: выразнае чытанне, вуснае славеснае маляванне, параўнанне верша і блізкіх да яго твораў выяўленчага і музычнага мастацтва, супастаўленне вершаў розных аўтараў на адну тэму, параўнанне арыгінала твора і яго перакладу. Любоў да творчасці нельга выхаваць без самой творчасці, без адчування роднага слова, яго дакладнасці і ўмення ім карыстацца.

Галоўная мэта творчых заданняў перш за ўсё развіццёвая – фарміраваць у вучняў мастацкі густ, адчувальнасць да мастацкага слова і разуменне таго, што праца пісьменніка зусім не простая, як здаецца на першы погляд. Эфектыўнымі з’яўляюцца прыёмы дапісвання апошняга радка верша, напісання верша па зададзенай схеме чаргавання складоў, складання верша па зададзеных рыфмах ці на прапанаваную тэму.

Для развіцця творчага ўяўлення і фантазіі вучняў прымяняю прыёмы складання сюжэтнага апавядання ад імя выбранага прадмета ці жывёлы (пераўвасабленне).

**Заданне 1.** Уяві, што ты – школьная парта. Складзі па плане ад імя парты апавяданне «Адзін дзень з майго жыцця».

1. Як ты аказалася ў школе і дзе была раней?
2. Чым займаешся ноччу, днём?
3. Як да цябе адносяцца дзеці – гаспадары школы?
4. Чаго ты не можаш зразумець?
5. Аб чым марыш?

Таксама прымяняю прыём складання апавядання з уменнем знаходзіць прычыну падзей, якая з’яўляецца фантастычнай, малаверагоднай, з уменнем звязаць паміж сабой якія-небудзь падзеі.

**Заданне 2.** Прыдумайце апавяданне, якое тлумачыць прычыну ўзнікнення наступных сітуацый:
*Школьны аўтобус зламаўся. – Я быў у школе раней за ўсіх.*

**Заданне 3.** Прыдумайце апавяданне, звязаўшы паміж сабой наступныя падзеі:
*По дарозе скакаў шэры заяц.*
*Сястра ў гэты дзень не дайшла да школы.*

Прымяняю ў сваёй практыцы і гульнёвую дзейнасць у форме творчых практыкумаў, трэнінгаў. Напрыклад: “Пагуляем у рыфмы”, “Збяры рассыпаныя радкі”, “Я пачну, а ты працягвай”.

**Заданне 1.** Злучы стрэлкамі адпаведныя радкі.
*Не паверыце, вы казку*
*Гультаём такім на падказку*
*Што канькі, цукерку, дзеці*
*Прамяняў бы быў Пеця*

**Заданне 2.** Падбярыце рыфмы да слоў (настаўнік кідае мячык вучням, вымаўляючы пры гэтым слова, да якога трэба падабраць рыфму).

**Заданне 3.** Падбяры лічбавы код харэя (ямба, дактыля, амфібрахія, анапеста).
Напрыклад, лічбавы код анапеста:
*14 – 102 Ужо золак заззяў,*



Репозиторий ВГУ

*10 – 8 – 1 Святло льецца ў прастор.*
*46 – 3 – 02 І ачнуўся ад сну –*
*3 – 5 – 21 Ціха шэпчацца бор.*
*Янка Журба “Усход сонца”*

**Заданне 4.** Дапішы радкі верша Якуба Коласа “Раніца вясною”.

*Ціха ў полі, ціха ў …,*
*Ані шэпне …,*
*Толькі дзесь у …*
*Льецца звонкі … .*

Узбагачэнню мовы вучняў спрыяе слоўнікавая работа. Таму пры напісанні вучнямі празаічных і вершаваных твораў выкарыстоўваю наступныя заданні:

**Заданне 1.** Складзіце слоўнік па тэме “*Радзіма”, “Зіма”, “Спорт”*.

**Заданне 2.** Прыдумайце, з чым можна параўнаць.

*Вясна, як...; вечар, як...; вочы, як...; даль, як...; крыніца, як...; лес, як...; луг, як...; песня, як...; рака, як...; слова, як...; усмешка, як... .*

**Заданне 3.** Падбярыце сінонімы да слоў *прыгожы, добры, вясёлы, празрысты, магутны.*

**Заданне 4.** Падбярыце эпітэты да слоў *Беларусь, рака, восень, лес, сонца, дарога, хмара.*

Для развіцця індывідуальнага мыслення і творчага ўяўлення выкарыстоўваю прыём “Апрані слова”.

Напрыклад: растлумачце лексічнае значэнне слова *самота* з урыўка з паэмы “Сымон-музыка” *(самота-адзінота, смутак, туга*). Назавіце марфалагічныя прыметы гэтага слова (назоўнік, ж.р., адз. л., Н. скл., неадушаўлёны). Падбярыце антонімы (*радасць, весялосць*). Назавіце гукі ў гэтым слове. Падбярыце рыфмы да яго (*работа, журбота, лістота, адзінота і г.д.*). Перакладзіце на рускую мову (*одиночество, уединение*). Складзіце словазлучэнне (*у ціхай самоце*). Складзіце сказ (*У ціхай самоце падала з дрэў апошняе лісце*). Ці чулі вы раней гэта слова? На наступным этапе вучні ствараюць свае тэксты. Творчыя заняткі маюць такую структуру:

1. Арганізацыйны момант.
2. Псіхалагічная падрыхтоўка:
   - слова настаўніка;
   - суразмоўніцтва з вучнямі;
   - выкарыстанне сродкаў нагляднасці (рэпрадукцыі карцін, фотаздымкі);
   - праслухоўванне музычных твораў.
3. Работа над творам:
   - выбар назвы;
   - выбар тропаў;
   - напісанне твораў.
4. Рэдагаванне творчых работ.
5. Чытанне твораў.

Падчас творчай працы вучні могуць карыстацца памяткамі “Алгарытм працы па напісанні верша”, “Асноўныя стопы і памеры”, “Мастацкія прыёмы”. Для напісання верша пра зіму прапаную вучням наступны алгарытм:

1. Уявіце малюнак зімняга пейзажу.
2. Прачытайце вершы беларускіх паэтаў на гэту тэму.
3. Выявіце прыёмы апісання зімы (параўнанне, сюжэт).
4. Выберыце ўласны прыём апісання.
5. Дайце вобразную назву вершу.
6. Запішыце першы радок верша.
7. Падбярыце рыфму і рытм.
8. Выберыце мастацкія асаблівасці.
9. Складзіце верш і прачытайце.

Мы карэктна дапамагаем юным творцам падабраць тое ці іншае слова, замяніць адно слова на другое, падказаць рыфму, скласці план. Потым адбываецца карэкцыя напісанага і чытанне твораў. Тэхналогія французскай майстэрні і яе элементаў, эфектыўныя метады і прыёмы дапамагаюць дасягнуць запланаванага выніку. Урокі літаратуры не дазваляюць займацца ў поўнай меры творчай дзейнасцю, таму факультатыўныя і стымулюючыя заняткі з'яўляюцца дапаўненнем да ўрокаў літаратуры.

На працягу апошніх год частымі гасцямі нашай школы былі пісьменнікі Уладзімір Ягоўдзік, Давід Сімановіч, Барыс Беляжэнка, якія давалі каштоўныя прафесійныя парады.

У выніку ў выхаванцаў значна павысілася цікавасць да роднай літаратуры, культуры, гісторыі. Вучні сталі больш назіральнымі, на ўроках яны лепш спраўляюцца з заданнямі павышанага ўзроўню. Работы вучняў змяшчаюцца ў школьным друку. Гэта павышае

Репозиторий ВГУ

цікавасць да творчасці і матывацыю. Мы выходзім з творчымі работамі на ўзровень раёна, вобласці, рэспублікі, чым прыцягваем увагу да нашай школы, садзейнічаем павышэнню яе статуса. З году ў год нашы вучні становяцца пераможцамі раённых конкурсаў паэтаў, празаікаў і журналістаў "Дэбют", "Крыніцы творчасці", "Выратавальнікі вачыма дзяцей", "Багач", "Моладзь за здаровы лад жыцця", "Моладзь і дзеці ў гады вайны", "Мой радавод". Таксама прымалі ўдзел у конкурсе сачыненняў, прысвечаных юбілеям пісьменнікаў; сталі лаўрэатамі абласнога літаратурнага конкурсу, прысвечанага 70-годдзю вызвалення Беларусі і Віцебскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у намінацыі "Проза" і "Паэзія". Неаднаразова прымалі ўдзел у конкурсе рэфератаў і сачыненняў, які праводзіў Інстытут тэалогіі святых Кірылы і Мяфодзія, і станавіліся пераможцамі. У 2014 годзе вучаніца 10 класа Асташкевіч Марыя стала дыпламантам міжнароднага конкурсу сачыненняў "Вера ў сэрцы маім" , прысвечанага 1025-годдзю хрышчэння Русі.

Вершы, апавяданні, казкі, замалёўкі, сачыненні друкаваліся ў раённай газеце "Зара", абласной газеце "Віцьбічы", рэспубліканскіх часопісах "Лесавік" і "Беларуская мова і літаратура", рэспубліканскай газеце "Юный спасатель". Нашы вучні прымаюць удзел у навукова-даследчых і краязнаўчых канферэнцыях, займаюць прызавыя месцы. Многія пасля заканчэння школы выбралі спецыяльнасці філолагаў і журналістаў. Выказванне М.А. Лазарука аб тым, што "менавіта з такіх вырастаюць творчыя працаўнікі ў розных галінах дзейнасці, нават тады, калі ім і не суджана стаць пісьменнікамі ці крытыкамі, мастакамі ці артыстамі" [2, с. 82], падыходзіць і да маіх выхаванцаў.

**Заключэнне.** Нашы вучні праяўляюць сябе ў розных відах дзейнасці, і іх творчасць запатрабавана. Калі вучні будуць пісаць творчыя работы, адточваць майстэрства, працаваць над кожным словам, то яно стане коласам у суквецці тых каласоў, якімі ганарымся мы – беларусы. Дапамагчы вучням спазнаць "старажытнейшую, самую славянскую мову", абудзіць у іх сэрцах любоў да беларускага слова – да гэтага імкнуся ў сваёй працы ў роднай Бачэйкаўскай школе.

ЛІТАРАТУРА


1. Белакоз, А. Вучу дзетак складаць вершы / А. Белакоз // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 10. – С. 39–42.
2. Лазарук, М.А. Навучанне і выхаванне творчасцю / М.А. Лазарук. – Мінск: Нар. асвета, 1994. – 200 с.
3. Ленсу, А.Я. Вывучэнне тэорыі літаратуры ў школе / А.Я. Ленсу. – Мінск: Нар. асвета, 1985. – 80 с.
4. Праскаловіч, В. Творчасць у літаратурным навучанні: тэарэтычныя асновы, метадычныя аспекты / В. Праскаловіч // Роднае слова. – 2010. – № 12. – С. 66–70.


Дадатак

## ТВОРЧЫЯ РАБОТЫ ВУЧНЯЎ

### Мая зямля – мая Радзіма *(Яна Грыц)*

Люблю сваю Радзіму я,
Люблю сваіх бацькоў.
Ты ў мяне адна, зямля,
Цячэ адна ў нас кроў.

Люблю я Беларусь сваю,
Бо беларуска я.
І вёску родную люблю,
Бо тут мая сям'я.

Цячэ рачулка Ула тут
І васількі цвітуць.
Прыгожы родны мілы кут,
У якім буслы жывуць.

Хачу, каб не было вайны
На ўсёй маёй зямлі,
Буслы б ляталі ў вышыні,
І васількі цвілі.

Рэпазіторый ВДУ

**Каляды** *(Алеся Патоцкая)*

Прывітанне вам, Каляды!
Вам заўсёды людзі рады,
Бо Хрыстос нарадзіўся
І ўвесь свет наш абудзіўся.

Варожаць людзі на Каляды
І робяць розныя абрады.
А пост калядны пастаянна
Яны захоўвалі старанна.

А на вячорках жартавалі
І ў Каляду ўсе гулялі,
Потым ішлі калядаваць,
Хрыста Ісуса ўхваляць.

Мядзведзя і казу вадзілі,
І зоркай шлях свой асвяцілі,
Яна асвеціць шмат шляхоў,
Як асвяціла для валхвоў.

А раніцай на Каляду
Сям'ёй мы пойдзем у царкву,
Бо трэба крыж пацалаваць,
Каб свята ў душу прыняць.

Пасля царквы бягом дамоў,
Бо трэба ўважыць і кароў,
І сенам іх пачаставаць,
Садзіцца і гасцей чакаць.

А на стале – гара прыпраў,
Стаіць тут многа розных страў.
А на Каляды стол багаты,
І святу гэтаму ўсе рады.

Віншую ўсіх з Раством Хрыстовым!
Жадаю быць заўжды здаровым.
Мы будзем песні зноў спяваць,
Хрыста Ісуса ўслаўляць.

**Першае каханне** *(Святлана Новік)*

Каханне першае згарае,
Як зорка яркая ўначы.
Але ўспамін аб ім світае
І, як ручай між траў, журчыць.

А пачуццё жыве нязгасна,
І працінае раптам боль.
О, мой расстайны лебедзь ясны,
Мы не сустрэнемся з табой…

Калі ж убачымся аднойчы,
Душа ўстрывожана ўздыхне.
Зірнуць з дакорам вочы ў вочы,
Ды не растане ў сэрцы снег.

…У сіняй вазе сохне кветка,
Як пра былое напамін.
Яна – сумотнейшая сведка,
Што ты ў душы маёй адзін.

**Перамога** *(Марыя Асташкевіч)*

Семдзесят год Перамогі
У Вялікай Айчыннай вайне
Адзначае народ мой стойкі.
Ён не стаў на калені, не!

Захлынуўся сваёй крывёю
Вораг, што на шляху ўставаў.
Наш баец па-геройску, з боем
Да Берліна фашыстаў гнаў.

І нарэшце вясна Перамогі
Завітала ў госці да нас!
Шлях прайшоўшы складаны, доўгі,
Адпусціла салдат у запас.

Дзякуй за ўсё, ветэраны,
Вы жыццё адстаялі ў баях.
Дзякуй за мір захаваны
Для вашых патомкаў у вяках!

**Адлёт жураvoў** *(Ігар Корнеў)*

Туман павольна адплывае
На недажатыя палі.
Вітальна ў небе заспявалі
Над роднай нівай журaўлі.

У іх курлыканні сумота,
Бо пакідаюць родны край,
Дзе хутка дол атуліць слота
І пацямнее небакрай.

Хай будзе лёгкаю дарога!
Ляціце шчасна ў вырай свой,
Але не баўцеся замнога,
Бо мы чакаем вас вясной.

Репозиторий ВГУ

**Парады школьнікам** *(Марыя Асташкевіч)*

Раскажу вам па парадку
Пра здаровы лад жыцця:
Раніцай рабі зарадку
Без звычайнага ныцця.

Потым не забудзь памыцца
І за стол сядай хутчэй.
А пасля пачысці зубы:
Усмешка будзе прыгажэй.

Зараз можна і ў школу.
Ранец з кніжкамі вазьмі,
Толькі лішні груз ніколі
За спіною не цягні.

Будзе стройная фігура
У цябе на зайздрасць усім,
І аптэчная мікстура
Не спатрэбіцца зусім.

А яшчэ хачу адзначыць:
Нельга дзецям піць, курыць,
Ды наогул усім людзям:
Тады будуць доўга жыць.

Быць здаровым – гэта модна!
Быць здаровым – гэта клас!
Будзем жыць з рэжымам згодна:
Патрабуе сёння час.

**Подзвіг у імя жыцця**
Апавяданне
*(Аляксандра Дармідошына)*

Стаяў цёплы летні дзень. Сонца лашчыла сваімі пяшчотнымі прамянямі ўсё, што бачыла на зямлі: дрэвы, кветкі, птушак, жывёл. Яно загледзелася на дзяцей, якія гулялі ў нейкія свае вясёлыя гульні. Позіркам, поўным здзіўлення, сонца глянула на маладую жанчыну, якую нейкі дзядзька вёз на кані ў суседнюю вёску. І адкуль сонцу было ведаць, што гэта ўрач Вольга Пятроўна, што яна спяшаецца да хворага.

Маладая жанчына заклапочана пазірала на гадзіннік. Думкі раіліся ў яе галаве, як пчолы. А думаць было аб чым.

Вайна пачалася раптоўна і нечакана. З боку Чашнік прыехалі немцы на матацыклах, выбілі дзверы ў магазіне, напіліся гарэлкі і паехалі далей. Потым прыляцелі фашысцкія самалёты, на ляту павырывалі крукамі нацягнуты дрот на слупах, і радыё анямела. Дні праз тры з'явілася шмат немцаў. У цэнтры вёскі размясцілі сваю камендатуру. Прывезлі і бургамістра – Ноймана. А яшчэ праз месяц завезлі яўрэяў у Бешанковічы і расстралялі.

Вольга думала пра свайго мужа, пра свайго мілага, добрага Хаіма, які не змог уцячы ад варожай кулі. Як ёй цяпер жыць? Як зберагчы дачушку, якая як дзве кроплі вады падобна да бацькі? Бургамістр быў неблагі. Ён выклікаў усіх да сябе, даў работу. Вользе сказаў працягваць сваю працу ў ролі ўрача, бо жыхарам патрэбна дапамога.

Вольга баялася пакідаць дзяўчынку дома адну, хоць той было сем гадоў. Яна брала Сонечку з сабой. Калі прымала хворых, давала ёй алоўкі, паперу, і дачка малявала. Але вось сёння Вольгу выклікалі ў дальнюю вёску, і яна пакінула Сонечку на сваю суседку, у якой было сваіх чацвёра дзяцей. Хутка справіўшыся, урач спяшалася дадому. Сонца свяціла ярка, цяплу і святлу радаваліся стракозы і матылі. Але на сэрцы было неспакойна. Неспакой і страх пасяліліся ў душы з таго дня, як на яе мужа фашыст сказаў: "Юда, шысэн". А праз некалькі дзён яго не стала.

Калі Вольга паехала ў вёску, то ўбачыла, што да яе бяжыць суседка і махае рукамі. Яна нешта крычала, плакала і паказвала рукою ў бок Лепеля. Вольга саскочыла з калёс, падбегла да жанчыны і спытала дрыготкім голасам:

– Што здарылася? Што з Соняй?

– З усіх вёсак сагналі застаўшыхся яўрэяў і павезлі на расстрэл у Камена. Тваю Сонечку таксама схапілі, – вінаватым голасам сказала яна.

– А божачкі! А што рабіць?

– Бяжым да бургамістра. Толькі ён можа дапамагчы.

Жанчыны прыбеглі ў камендатуру. Бургамістр быў на месцы. Вольга ўпала перад ім на калені, але слёзы душылі яе, не давалі гаварыць. У некалькіх словах суседка расказала, што зда-



Репозиторий ВГУ

рылася. Нойман усё зразумеў. Ён напісаў запіску і загадаў хутчэй ехаць у Камена. Жанчыны падхапіліся і паняслiся. Конь яшчэ не быў распрэжаны. Разамлелы ад сонца, ён чакаў, калі яго распрагуць, напояць і накормяць.

Вольга падбегла да калёс, села, узяла лейцы.

– Пачакай! – закрычала суседка. – Я сыну скажу, каб адвёз цябе.

Пятнаццацігадовага Толіка прасіць не трэба было, ён быў сведкам усяго, што адбылося.

Дарога да Камена, а гэта было кіламетраў шаснаццаць, здалася самай доўгай за ўсё жыццё, хаця Толік гнаў каня што ёсць сілы.

…Здалёк Вольга ўбачыла фашыстаў, якія ўжо ад’язджалі, зрабіўшы сваю чорную справу. Яна спынілася, анямеўшая, падышла да рова, засыпанага свежай зямлёй. А божачкі! Зямля шавялілася. Яна дыхала. Там, пад ёй, былі яшчэ жывыя людзі. Там яе Сонечка!

Яна асела на зямлю. Толік падбег да цёткі Вольгі, абняў яе, быццам закрываючы ад нейкага нявіднага ворага, і ціха сказаў:

– Мы адпомсцім.

…Дадому вярнуліся пад вечар. Вольга пасівела за некалькі гадзін. У яе вачах свяціўся нездаровы агонь. Было бачна, што яна нешта задумвае. Тыдзень жанчына маўчала, выношваючы план помсты.

І вось гэты дзень настаў. Вольга пайшла ў партызаны. Дарогу да Ушач яна ведала добра. Ішла балотам,ляснымі сцяжынкамі. У кішэні несла гранату, якую ёй даў Толік. Дзе ён яе ўзяў, не пыталася. Толік таксама хацеў з ёй пайсці, але Вольга сказала, што ён яшчэ малы.

…Партызаны абрадаваліся ўрачу, бо трэба было лячыць хворых і параненых. Аб тым, каб Вольга ўдзельнічала ў баях, нават і слухаць не хацелі. Але яна чакала зручнага моманту, і такі момант настаў. У адну з начэй партызаны атакавалі гарнізон у вёсцы. Поўная рашучасці, Вольга пайшла следам. Але застрачыў нямецкі кулямёт, і партызаны адступілі. Тады Вольга непрыкметна падпаўзла да крайняй хаты, адкуль чуліся стрэлы, і са словамі “Гэта вам за мужа майго, за маю дачушку!” кінула гранату. Выбух быў моцны. Але Вольга ўжо яго не чула. Яна не бачыла, што партызаны пайшлі ў атаку, што яны знішчылі шмат ворагаў, забралі ўсю зброю. Яна цяпер была на небе разам са сваім мілым Хаімам і любай дачушкай Сонечкай.

Яна не дажыла, не даспявала, не дакахала… У імя жыцця…

Репозиторий ВГУ